# ЛАЎРЭАТЫ СКАРЫНАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ-2000



**ДРАЧОЎ** Уладзімір Карпавіч — доктар эканамічных навук з кафедры эканамічных тэорый.

Званне лаўрэата Скарынаўскіх чытанняў прысуджана за манаграфію "Раздзяржаўленне і прыватызацыя (на матэрыялах Беларусі)", выдадзеную ў 1999 годзе аб'ёмам 13,8 друкаваных аркушаў. Яна з'яўляецца першай манаграфіяй у нашай рэспубліцы на гэтую тэму.



**ЕРМАКОЎ** Уладзімір Рыгоравіч — к.ф.-м.н., дацэнт кафедры матэматычнага аналізу.

Аўтар 33 друкаваных навуковых прац, у тым ліку манаграфіі "Тэорыя фарміруючага кантролю ў сістэме развіваючайся адукацыі", выдадзенай у 1998 г.



**РЫЧКОЎ** Аляксандр Яўгенавіч — к.сац.н., ст.выкладчык кафедры палітычнай сацыялогіі.

У конкурсе адной з лепшых прызнана выдадзеная ў 1999 г. яго манаграфія "Дзяўчынка-падлетак у сучасным грамадстве і яе сацыяльныя праблемы: сацыялагічны аналіз". Аўтарам разгледжана актуальная тэма на аснове асабістых даследаванняў, што дазваляе выкарыстаць яе ў практычнай рабоце.



**РУЖЫЦКАЯ** Алена Рудольфаўна — к.ф.-м.н., дацэнт кафедры ВМ і праграміравання.

Аўтар цыкла навуковых прац "Сінтэз аптымальных інварыянтна-устойлівых сістэм кіравання". Атрыманыя ёй вынікі апублікаваны ў беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх навуковых выданнях.



**ХАХОМАЎ** Сяргей Анатольевіч — к.ф.-м.н., дацэнт кафедры агульнай фізікі.

Лаўрэатам прызнаны за цыкл работ "Аб'ёмістыя акустычныя хвалі ў крышталях у вярчальным электрычным полі". Аб выніках сваіх даследаванняў, апублікаваных у манаграфіі , ён дакладваў на навуковых канферэнцыях у Францыі і Германіі.

## ПРАЕКТ КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР на 2000-2001 г.г. ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ф.СКАРЫНЫ

### 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Гэты Калектыўны дагавор заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам і адміністрацыяй універсітэта, якая прадстаўлена рэктарам.

1.2. Дагавор з'яўляецца нарматыўным актам і рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж адміністрацыяй ГДУ і работнікамі працоўнага калектыву, які налічвае 1300 чалавек.

1.3. Пагадненне паміж рэктарам і прафкомам студэнтаў па сацыяльна-эканамічных пытаннях з'яўляецца дадаткам да Калектыўнага дагавора № 1.

1.4. Дагавор заключаецца ў пісьмовай форме на два гады на падставе Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15.07.95 г. № 278 "Аб развіцці сацыяльнага партнёрства ў Рэспубліцы Беларусь", і "Пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і Рэспубліканскім камітэтам прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі" і ўключае ў сябе:

— абарону сацыяльна-эканамічных інтарэсаў работнікаў;

— раўнапраўе бакоў;

— улік рэальных магчымасцей матэрыяльнага, вытворчага і фінансавага забеспячэння прымаемых абавязацельстваў.

1.5. Калектыўны дагавор уступае ў сілу з моманту яго падпісання і дзейнічае да заключэння новага. Адміністрацыя абавязана азнаёміць усіх работнікаў, у тым ліку ўпершыню прынятых, з дзеючым Калектыўным дагаворам, для чаго размножыць яго і ў месячны тэрмін забяспечыць ім структурныя падраздзяленні і службы універсітэта.

1.6. Адміністрацыя абавязуецца інфармаваць прафком і супрацоўнікаў універсітэта аб усіх рашэннях, якія прымаюцца: размеркаванне жылля, фондавага забеспячэння, прэміравання і г.д.

1.7. Змяненні і дапаўненні Калектыўнага дагавора, пры пагадненні бакоў, уносяцца на працягу яго тэрміну дзеяння на пашыраным пасяджэнні Савета універсітэта і прафкома.

1.8. Вядзенне перамоў на раўнапраўнай аснове, падрыхтоўку і кантроль за выкананнем Калектыўнага дагавора ажыццяўляе камісія ўпаўнаважаных прадстаўнікоў адміністрацыі і прафкома. З боку рэктарата: Кармазін А.П., першы прарэктар; Міжэвіч М.М., юрысконсульт; Пашук С.Я., начальнік планава-фінансавага аддзела; прафкома: Варатніцкі Г.І., старшыня прафкома; Дубяк Т.М., спецыяліст І катэгорыі рэдакцыі газеты "Гомельскі універсітэт"; Семянкоў А.М., заг.лабараторыямі біялагічнага факультэта. Тэрміны вядзення перамоў не могуць быць перавышаны больш за адзін месяц.

1.9. Бакі абавязуюцца кожнае паўгоддзе разглядаць ход выканання Калектыўнага дагавора на сумесным пасяджэнні Савета універсітэта і прафкома і аб выніках інфармаваць праз газету "Гомельскі універсітэт".

1.10. Рэктарат пасля падпісання Калектыўнага дагавора ў двухтыднёвы тэрмін выдае загад аб арганізацыі выканання мерапрыемстваў, якія ўваходзяць у дагавор.

1.11. Калектыўны дагавор падпісваецца рэктарам і старшынёй прафкома.

1.12. Асобы, вінаватыя ў невыкананні (парушэнні) умоў Калектыўнага дагавора, могуць быць пазбаўлены часткова або поўнасцю прэміі, надбавак, а таксама на іх можа быць накладзена дысцыплінарнае спагнанне.

### 2. ГАРАНТЫІ ПА АПЛАЦЕ ПРАЦЫ

2.1. Крыніцамі фінансавання плануемых мерапрыемстваў па Калектыўнаму дагавору з'яўляюцца каштарысы выдаткаў па бюджэтнай і пазабюджэтнай дзейнасці:

2.1.1. Плануемы аб'ём грашовых сродкаў, якія выдзяляюцца з бюджэту, 1321,6 млн.руб.;

2.1.2. Фонд аплаты працы, які выдзяляецца з бюджэту на плануемы год, 495,7 млн.руб.;

2.1.3. Плануемыя пазабюджэтныя паступленні 266,1 млн.руб., у тым ліку на аплату працы 82,9 млн.руб.;

2.1.4. Паступленні за кошт дабрачынных узносаў прадпрыемстваў, арганізацый, грамадзян — руб.;

2.1.5. Паступленні за кошт здачы ў арэнду памяшканняў, абсталявання і інвентару 5,1 млн.руб.

### 3. АРГАНІЗАЦЫЯ І АПЛАТА ПРАЦЫ

3.1. Адміністрацыя універсітэта абавязуецца не дапускаць вучэбную нагрузку больш 6 аўдыторных гадзін па асноўнай рабоце і 9 гадзін — з улікам сумяшчальніцтва, правядзення больш аднаго экзамена ў дзень. Работы ў выхадныя дні дапускаць у выключных выпадках, афармляючы ў адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Адказн.** Папкова Н.І., заг. кафедрамі, пастаянна.

3.2. З мэтай паляпшэння ўмоў працы і вучобы студэнтаў, санітарна-гігіенічнага стану памяшканняў, рацыянальнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы дэканам факультэтаў сваім распараджэннем замацаваць аўдыторны фонд за студэнцкімі групамі.

**Адказн.** Папкова Н.І., дэканы факультэтаў, пастаянна.

3.3. Сярэдні аб'ём вучэбнай нагрузкі выкладчыкам на навучальны год устанаўліваць з улікам агульнага аб'ёму вучэбнай нагрузкі па універсітэту і пагадзіннага фонду, зацверджанага Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Адказн.** Пашук С.Я., Папкова Н.І., штогод.

3.4. Па рашэнню кафедр дазволіць штатным супрацоўнікам універсітэта, якія не маюць сумяшчальніцтва, выкананне пагадзіннай нагрузкі ў аб'ёме да 0,5 штатнай вучэбнай нагрузкі.

**Адказн.** Кармазін А.П., Папкова Н.І., на працягу года.

3.5. Забяспечыць выкананне правілаў унутранага распарадку і захаванне працоўнай дысцыпліны выкладчыкамі і супрацоўнікамі. Адзін раз у месяц праводзіць выбарачную праверку захавання дысцыпліны ў структурных падраздзяленнях з апублікаваннем яе вынікаў у друку.

**Адказн.** аддзел кадраў, прафком, кіраўнікі структурных падраздзяленняў, на працягу года.

3.6. Забараніць выкарыстанне ў рабочы час рабочых і служачых на работах, не звязаных з іх службовымі абавязкамі.

**Адказн.** рэктарат, прафком, на працягу года.

3.7. Адміністрацыя універсітэта і прафком абавязуюцца абараняць існуючую рэдакцыю абзаца 7 арт. 34 Закона "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

**Адказн.** Селькін М.В., Варатніцкі Г.І.

3.8. Аплату працы выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі акладамі і тарыфнымі стаўкамі па дзеючаму заканадаўству. Выплату заработнай платы пры своечасовым фінансаванні праводзіць: аванс — з 18 чысла, разлік за месяц і пагадзінную аплату — з 3 чысла наступнага месяца.

**Адказн.** Курава І.А., Пашук С.Я.

3.9. Сумы, нявыплачаныя работнікам за мінулыя перыяды і сысканыя ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, выплачваюцца работніку з улікам іх індэксацыі ў адпаведнасці з Законам аб індэксацыі.

**Адказн.** Курава І.А.

3.10. Выдачу разліковых лісткоў праводзіць па ўсіх відах заработнай платы.

**Адказн.** Курава І.А.

3.11. Адміністрацыя абавязуецца ў межах сродкаў, якія накіроўваюцца на аплату працы:

3.11.1. Устанаўліваць даплаты работнікам, занятым на работах з неспрыяльнымі ўмовамі працы ў памеры 0,1-0,31% тарыфнай стаўкі першага разраду за кожную гадзіну работы ў гэтых умовах працы.

**Адказн.** Селькін М.В., Курава І.А., Пашук С.Я., Яўстраценка А.В.

3.11.2. Праводзіць даплаты работнікам за работу ў начны час у памеры 40 % тарыфнай стаўкі (аклада) работніка за кожную гадзіну работы ў начны час з 22 гадзін да 6 гадзін раніцы. Памеры гэтых даплат на работах у надзвычайных сітуацыях, на якіх напружанне, інтэнсіўнасць, небяспека працы ў начны час павышаюцца (ліквідацыя аварый, стыхійных бедстваў), могуць павялічвацца да 55% гадзіннай тарыфнай стаўкі (аклада) работніка.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.3. Выплачваць вадзіцелям грузавых і легкавых аўтамабіляў, аўтобусаў штомесячныя надбаўкі за класнасць: вадзіцелям 2-га класа ў памеры 10% і вадзіцелям 1-га класа - 25% устаноўленай тарыфнай стаўкі за адпрацаваны ў якасці вадзіцеля час.

**Адказн.** Селькін М.В., Навуменка П.М., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.4. Устанаўліваць даплаты вадзіцелям легкавых аўтамабіляў за ненарміраваны рабочы дзень у памеры да 25% тарыфнай стаўкі за адпрацаваны час.

**Адказн.** Селькін М.В., Навуменка П.М., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.5. Устанаўліваць даплаты брыгадзірам з ліку рабочых, не вызваленых ад асноўнай работы, за кіраўніцтва брыгадай у памеры да 26% ад тарыфнай стаўкі першага разраду ў залежнасці ад колькасці брыгады (брыгады ствараюцца пры колькасці не менш 5 чалавек).

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.6. Прымяняць штомесячныя аклады замест тарыфных ставак высокакваліфікаваным рабочым, занятым на асабліва важных і адказных работах, зыходзячы з тарыфнай стаўкі першага разраду і ўстаноўленага тарыфнага каэфіцыента.

**Адказн.** Селькін М.В., Навуменка П.М., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.7. Устанаўліваць надбаўкі кіраўнікам, спецыялістам і служачым за высокія творчыя, вытворчыя дасягненні ў рабоце, складанасць і напружанасць працы, а таксама за выкананне асабліва важных (тэрміновых) работ у памеры да 50% пасадавага акладу (стаўкі), накіроўваючы на гэтыя мэты 10% планавага фонду заработнай платы штатных работнікаў. Устанаўленне надбавак ажыццяўляецца на падставе "Палажэння аб матэрыяльным стымуляванні працы работнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны" (дадатак № 2) па ўзгадненню з прафкомам.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.8. З мэтай стымулявання павышэння прафесійнага майстэрства рабочых і служачых і ўзмацнення іх матэрыяльнай зацікаўленасці і адказнасці за выкананне вытворчых заданняў уводзіць дыферэнцыраваныя надбаўкі да іх тарыфных ставак за

(ПРАЦЯГ на 3-й стар.)

**ПРАЕКТ**

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР на 2000-2001 г.г. ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ф.СКАРЫНЫ

**(ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК на 2-й стар.)**

прафесійнае майстэрства: для 3-га разраду — 12%, 4-га разраду — да 16%, 5-га разраду — да 20%, 6-га разраду — да 24%, 7-га разраду — да 28%, 8-га разраду - да 32% адпаведнай тарыфнай стаўкі.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.9. Устанаўліваць даплаты за сумяшчэнне прафесій (пасад), пашырэнне зоны абслугоўвання (павелічэнне аб'ёму выконваемых работ) або выкананне абавязкаў работніка, які часова адсутнічае, спецыялістам і служачым у памеры да тарыфнай стаўкі (акладу) адсутнічаючага работніка ў залежнасці ад аб'ёму выконваемых работ.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.10. Праводзіць павышэнне тарыфных ставак і акладаў, разлічаных у адпаведнасці з устаноўленай тарыфнай стаўкай першага разраду, за стаж работы па спецыяльнасці (у галіне) у наступных памерах :

ад 1 да 5 гадоў — 10%;
ад 5 да 10 гадоў — 15%;
ад 10 да 15 гадоў — 20%;
ад 15 гадоў і вышэй — 30%.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.11. Устанаўліваць асноўным катэгорыям спецыялістаў, якія маюць кваліфікацыйныя катэгорыі, надбаўкі ў наступных памерах:

за вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю — 30%;
за 1 кваліфікацыйную катэгорыю — 20%;
за 2 кваліфікацыйную катэгорыю — 15%.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.11.12. Праводзіць прэміраванне работнікаў, накіроўваючы на гэтыя мэты выдзяляемыя з бюджэту сродкі ў памеры 20% планавага фонду заработнай платы штатных супрацоўнікаў і эканомію сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, на падставе "Палажэння аб матэрыяльным стымуляванні работнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны" (дадатак № 2) па ўзгадненню з прафкомам.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.,А., Пашук С.Я.

3.11.13. Прадугледжваць сродкі на аказанне матэрыяльнай дапамогі ў памеры 5% планавага фонду заработнай платы штатных работнікаў. Аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам праводзіць у адпаведнасці з "Палажэннем аб аказанні матэрыяльнай дапамогі супрацоўнікам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны" (дадатак № 4) па ўзгадненню з прафкомам.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.12. Умовы аплаты працы, названыя ў пункце 3.11., распаўсюджваюцца не толькі на работнікаў універсітэта, фінансуемых за кошт бюджэтных асігнаванняў, але таксама на работнікаў, якія ўтрымліваюцца за кошт сродкаў пазабюджэтнай дзейнасці, у тым ліку навукова-даследчага сектара, інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

**Адказн.** Селькін М.В., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.13. Аплата працы работнікаў гаспразліковага падраздзялення па пазабюджэтнай дзейнасці "Прадпрыемствы грамадскага харчавання" праводзіцца на падставе Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў Рэспублікі Беларусь і рэкамендацый па яе прымяненню, зацверджаных пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 21 студзеня 2000 года № 7. Стаўка 1-га разраду ўстанаўліваецца на падставе "Парадку павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду ў залежнасці ад росту аб'ёмаў вытворчасці, рэалізацыі прадукцыі і эфектыўнасці гаспадарання суб'ектамі гаспадарання дзяржаўнай формы ўласнасці...", зацверджанага пастановай-загадам Мінпрацы, Мінфіна, Мінэканомікі і Мінстата Рэспублікі Беларусь № 10/18/8/29 ад 22/29 студзеня 1999 года.

3.14. Умовы аплаты працы, названыя ў п.3.11., распаўсюджваюцца таксама на работнікаў "Прадпрыемствы грамадскага харчавання" з 1 студзеня 2000 года, зыходзячы са стаўкі першага разраду, устаноўленай для прадпрыемства.

**Адказн.** Селькін М.В., Курава І.А., Пашук С.Я., Соціева Т.М.

3.15. Выплату адпускных праводзіць не пазней чым за дзень да пачатку водпуску.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А.

3.16. Пры звальненні работніка выплата ўсіх сум, якія яму належаць, праводзіцца не пазней дня звальнення.

**Адказн.** Кармазін А.П., Курава І.А.

3.17. Устанавіць, што для скарачаемых работнікаў у перыяд тэрміна папярэджання аб скарачэнні (2 месяцы) работнік выконвае свае працоўныя абавязкі, падпарадкоўваецца правілам унутранага распарадку, яму гарантуюцца ўмовы і аплата працы нароўні з іншымі працуючымі. Пры павышэнні заработнай платы скарачаемаму работніку зарплата павышаецца нароўні з тымі, хто застаецца ў штаце, а таксама захоўваюцца іншыя, прадугледжаныя сістэмай аплаты працы выплаты кампенсуючага і стымулюючага характару (надбаўкі, прэміі, даплаты).

**Адказн.** Кармазін А.П., Пашук С.Я.

3.18. Аплочваць у адпаведнасці з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь святочныя і звышурочныя работы работнікам з пачасовай аплатай працы, а таксама тых, хто атрымлівае пасадавыя аклады, — не ніжэй двайных гадзінных ставак (акладаў): дзяжурным па інтэрнату, швейцарам, вартаўнікам.

**Адказн.** Селькін М.В., Курава І.А., Пашук С.Я.

3.19. Супрацоўнікаў, якія працуюць на кіруючых пасадах ва універсітэце, калі яны не падлягаюць замяшчэнню шляхам выбараў, назначаць з улікам меркаванняў прафсаюзнага камітэта.

**Адказн.** рэктар, старшыня прафкома, начальнік аддзела кадраў.

**Адміністрацыя абавязуецца:**

3.20. Па выніках гаспадарчай дзейнасці на матэрыяльнае стымуляванне і сацыяльную падтрымку работнікаў накіроўваць 40% ад сумы перавышэння даходаў над расходамі, што застаецца ў распараджэнні універсітэта. Указаныя сродкі выкарыстоўваюцца згодна прыкладваемага каштарысу.

Астатнія 60% накіроўваюцца на ўмацаванне матэрыяльнай базы універсітэта, неабходнай для забеспячэння вучэбнага і навуковага працэсу, і на частковае пакрыццё расходаў па ўтрыманню інтэрнатаў для работнікаў (каштарыс прыкладваецца).

## 4. ПРАВАВОЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН, РАЗВІЦЦЁ САЦЫЯЛЬНАГА ПАРТНЁРСТВА

4.1. Пры падрыхтоўцы нарматыўных дакументаў, якія закранаюць сацыяльна-эканамічныя інтарэсы работнікаў універсітэта, іх прававое і эканамічнае становішча, даваць магчымасць камітэту прафсаюза прымаць удзел у распрацоўцы ўказаных дакументаў.

4.2. Своечасова накіроўваць камітэту прафсаюза загады, іншыя дакументы рэктарата, якія датычаць пытанняў умоў, арганізацыі, аховы і аплаты працы, сацыяльна-эканамічнага становішча работнікаў універсітэта.

4.3. Нарматыўныя акты па пытаннях аплаты, нарміравання і аховы працы, працоўных праваадносін і іншых пытаннях, якія датычаць працоўных і сацыяльна-эканамічных правоў работнікаў універсітэта, прымаюцца адміністрацыяй па ўзгадненню з камітэтам прафсаюза.

4.4. Захаваць у адпаведнасці з дзеючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння вакантных пасад.

**Адказн.** Селькін М.В., Осіпава Т.І., Залатарэнка В.Ю.

4.5. У выпадку вытворчай неабходнасці (папярэджанне стыхійнага бедства, вытворчай аварыі, няшчаснага выпадку, замяшчэнне работніка, які часова адсутнічае) адміністрацыя мае права пераводзіць работніка на неабумоўленую працоўным дагаворам работу.

**Адказн.** Кармазін А.П., Осіпава Т.І, на працягу года.

4.6. Не дапускаць без згоды прафсаюзнага камітэта распродажу маёмасці універсітэта, якая спісваецца.

**Адказн.** рэктарат.

4.7. Адміністрацыя абавязуецца не здымаць арэндную плату і камунальныя паслугі за выкарыстанне памяшканняў сталовай № 3, кафэ пры сталовай № 3 "Прадпрыемства грамадскага харчавання" для правядзення ўрачыстых вечароў і вяселляў для супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў універсітэта.

4.8. Адміністрацыя універсітэта прадастаўляе кароткатэрміновы водпуск без захавання заработнай платы па пісьмовай заяве работніка ў выпадку смерці членаў сям'і, асабістага вяселля або вяселля дзяцей, нараджэння дзіцяці, афармлення спадчыны, для догляду за хворымі членамі сям'і, уборкі ўраджаю на дачным участку, у першы дзень навучальнага года для бацькоў, чые дзеці ідуць у 1-4 клас, і іншых выпадках.

4.9. Прадастаўляць мужу і жонцы, якія працуюць ва універсітэце, працоўныя водпускі па іх заяве адначасова.

4.10. Адміністрацыя не мае права прымушаць работніка да выхаду ў водпуск без захавання заработнай платы без яго згоды.

4.11. Прадастаўляць вучэбныя водпускі ў сувязі з навучаннем у вячэрніх і завочных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах работнікам, якія навучаюцца без адрыву ад вытворчасці, без накіравання адміністрацыі, заключэння дагавора.

4.12. Прадастаўляць адзінокім маці, разведзеным жанчынам і ўдовам, якія маюць па аднаму і больш дзяцей да 14 гадоў або дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, працоўны водпуск у зручны для іх час.

4.13. Пры наяўнасці ў работніка пуцёўкі на санаторна-курортнае лячэнне на працягу вучэбнага года ў перыяд, які не супадае з працоўным водпускам, яму прадастаўляецца працоўны водпуск, а ў выпадку яго выкарыстання — водпуск без захавання заработнай платы.

4.14. Дзецям супрацоўнікаў, якія добрасумленна адносяцца да працы і адпрацавалі ва універсітэце больш 3-х гадоў, зменшыць аплату за навучанне на дагаворнай аснове на 20%, а адпрацаваўшых ва універсітэце 10 і больш гадоў — на 30%.

4.15. Змяненні існуючых умоў працы (гарантыі, рэжым працы, размеркаванне вучэбнай нагрузкі, прысваеннне разраду) у сувязі з абгрунтаванымі вытворчымі, арганізацыйнымі і эканамічнымі прычынамі ажыццяўляюцца адміністрацыяй па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам.

Індывідуальныя спрэчкі па ўстанаўленні і змяненні існуючых умоў працы вырашаюцца адміністрацыяй і прафсаюзным камітэтам.

4.16. Аказваць дзейсную дапамогу ў рабоце Савету ветэранаў ВАВ і працы, а таксама жансавету.

4.17. Пры фарміраванні дэлегацый, якія выязджаюць на канферэнцыі, нарады па пытаннях сацыяльнага статусу педагагічных кадраў, удасканальванню іх прафесійнага майстэрства, уключаць у іх склад прадстаўнікоў прафсаюзнага камітэта.

4.18. Аказваць фінансавую дапамогу пры наяўнасці сродкаў (для добраўпарадкавання) ствараемым САТ універсітэта.

4.19. Пры звальненні супрацоўніка ў сувязі з выхадам на пенсію або па іншых уважлівых прычынах устанавіць аднаразовае матэрыяльнае ўзнагароджанне за добрасумленную працу:

1) пры стажы работы ў ГДУ імя Ф.Скарыны 25 гадоў — 3 аклады;
2) звыш 15 гадоў — 2 аклады;
3) звыш 10 гадоў — 1 аклад.

## 5. ГАРАНТЫІ ЗАНЯТАСЦІ

**5.1. Рэктарат абавязуецца:**

5.1.1. Паведамляць у прафсаюзны камітэт не пазней, чым за тры месяцы, аб прадстаячай ліквідацыі або рэарганізацыі структурных падраздзеяленняў, калі гэта выкліча скарачэнне рабочых месцаў або пагаршэнне ўмоў працы. Праводзіць з прафсаюзным камітэтам перагаворы па захаванню правоў і законных інтарэсаў вызваляемых работнікаў.

5.1.2. Не дапускаць беспадстаўнага скарачэння работнікаў і рабочых месцаў, своечасова перапрафіліраваць ранейшыя і ствараць новыя рабочыя месцы.

**5.2. Камітэт прафсаюза абавязуецца:**

5.2.1. Ажыццяўляць кантроль за выкананнем заканадаўства аб занятасці, за тым, ці даюцца вызваляемым работнікам ільготы і кампенсацыі.

5.2.2. Не здымаць з прафсаюзнага ўліку вызваляемых работнікаў да іх працаўладкавання.

5.2.3. Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка па пунктах 1,3,4,5 арт.42 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь праводзіцца з папярэдняй згоды прафсаюзнага камітэта; па пункту 9 арт.42 і пункту 1 арт. 47 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, датэрміновае скасаванне кантракта па дадатковых падставах, прадугледжаных падпунктам 2.10 пункта 2 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 29 ад 26.07.1999 года — пасля папярэдняга, не пазней чым за два тыдні, паведамлення прафсаюзнага камітэта.

5.2.4. Пры скарачэнні колькасці або штата работнікаў аддаваць перавагу для пакідання на рабоце ў выпадку роўнай прадукцыйнасці працы і кваліфікацыі (акрамя катэгорый, указаных у арт.45 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь і іншых заканадаўчых актах) работнікам, якія з'яўляюцца адзінымі кармільцамі ў сям'і, сямейным пры наяўнасці двух і больш утрыманцаў, тым, хто мае доўгатэрміновы бесперапынны стаж работы ў дадзенай установе, хто атрымаў траўму або прафзахворванне на прадпрыемстве, работнікам, якім да пенсіі засталася мінімальная колькасць гадоў (2-5), работнікам, выбраным у састаў прафсаюзных органаў, членам камісій па працоўных спрэчках.

5.2.5. У перыяд папярэджвання работніка аб скарачэнні дазволіць яму адсутнічаць на працоўным месцы для самастойнага пошуку працы адзін дзень ў тыдзень без аплаты, а па дамоўленасці з наймальнікам — з захаваннем заработнай платы.

5.2.6. Пры заключэнні працоўных дагавораў, уключаючы кантракты, бакі працоўнага дагавора кіруюцца арт. 17 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

5.2.7. Устанавіць, што заключэнне кантрактаў з работнікамі, працоўныя дагаворы з якімі былі заключаны на нявызначаны тэрмін, ажыццяўляецца ў сувязі з абгрунтаванымі вытворчымі, арганізацыйнымі і эканамічнымі прычынамі, аб чым работнік павінен быць пісьмова папярэджаны не пазней, чым за 1 месяц да заключэння кантракта (арт.32 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

5.2.8. Устанавіць, што работнік, які працуе па кантракту, можа скасаваць датэрмінова кантракт па асабістаму жаданню, паведаміўшы аб гэтым наймальніка пісьмовай заявай за адзін месяц. Са згоды бакоў кантракт можа быць скасаваны да заканчэння тэрміна паведамлення.

5.2.9. Устанавіць, што кантракты з асобамі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, заключаюцца на тэрмін не менш аднаго года.

5.2.10. Устанавіць, што заключэнне кантрактаў з работнікамі адбываецца пры ўдзеле прадстаўніка прафсаюзнага камітэта.

5.2.11. Дзеянне дадзенага Калектыўнага дагавора распаўсюджваецца на ўсе катэгорыі работнікаў, якія заключылі кантракты.

## 6. АХОВА ПРАЦЫ

6.1. Адміністрацыя абавязуецца:

6.1.1. Для забеспячэння нармальных умоў працы выканаць мерапрыемствы, прадугледжаныя пагадненнем па ахове працы (дадатак № 3).

6.1.2. Штогод падводзіць вынікі работы падраздзяленняў па паляпшэнню ўмоў і аховы працы, прафілактыцы вытворчага траўматызму і іншых няшчасных выпадкаў.

6.1.3. Сістэматычна ажыццяўляць кантроль за станам аховы працы, прымаць меры па ўдасканальванню гэтай работы.

6.1.4. Штогод арганізоўваць праходжанне медыцынскага агляду работнікаў, якія працуюць у шкодных умовах працы, бясплатна выдаваць малако і сродкі індывідуальнай аховы (спецадзенне, аптэчкі, мыючыя сродкі).

**Адказн.** інжынер па ТБ і ахове працы, кіраўнікі падраздзяленняў.

6.1.5. Арганізоўваць утрыманне аўдыторый, лабараторый, вытворчых памяшканняў і працоўных месцаў, месцаў агульнага карыстання ў адпаведнасці з санітарна-гігіенічнымі нормамі і правіламі.

**(ЗАКАНЧЭННЕ на 4-й стар.)**

# ПРАЕКТ КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР на 2000-2001 г.г. ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ф.СКАРЫНЫ

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК на 2-й і 3-й стар.)

**Адказн.** каменданты вучэбных карпусоў, Папкова Н.І.

6.1.6. Праводзіць інвентарызацыю плошчаў і замацаваных плошчаў за падраздзяленнямі, зыходзячы з санітарных нормаў і выконваемых функцый.

**Адказн.** Папкова Н.І., інжынер па ТБ і ахове працы.

6.1.7. Устанаўліваць персанальную адказнасць за парушэнне тэхнікі бяспекі на працоўным месцы.

6.1.8. Інжынеру па тэхніцы бяспекі штогод праводзіць семінары па падраздзяленнях па пытаннях ТБ і аховы працы.

**6.2. Прафком абавязуецца:**

6.2.1. Абараняць правы работнікаў на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы, матэрыяльныя інтарэсы асоб, якія пацярпелі ў выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці, членаў іх сямей.

6.2.2. Сумесна з аддзелам кадраў і службай аховы працы і ТБ не радзей аднаго раза ў год аналізаваць стан вытворчага траўматызму, паўнату прадастаўлення прадугледжаных заканадаўствам кампенсацый за работу ў шкодных умовах працы.

## 7. КУЛЬТУРНАЯ І СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ РАБОТА, АРГАНІЗАЦЫЯ АДПАЧЫНКУ

**7.1. Прафком і адміністрацыя абавязуюцца:** наладжваць калектыўны прагляд супрацоўнікамі спектакляў у абласным драмтэатры, а для дзяцей — цыркавых праграм, для дарослых арганізоўваць сумесныя сустрэчы Новага года, 8 Сакавіка, для дзяцей — навагодніх ранішнікаў; па магчымасці выдзяляць сродкі для сумеснага святкавання найбольш знамянальных дат, для ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны праводзіць "Агеньчыкі" у гонар Дня Перамогі, Дня абаронцаў Айчыны.

**Адказн.** прафком, рэктарат.

**7.2. Прафком абавязуецца:** аказваць садзейнічанне ў набыцці супрацоўнікам і іх дзецям пуцёвак у санаторыі, дамы і на базы адпачынку, у дзіцячыя лагеры. Своечасова даводзіць да ведама калектыву аб зменах парадку выдачы пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку. Забяспечыць строгі кантроль за правільным размеркаваннем і выдачай пуцёвак на санаторна-курортнае лячэнне і адпачынак.

**Адказн.** прафком, камісія па аздараўленню.

7.3. Адміністрацыя універсітэта аказвае садзейнічанне ў набыцці пуцёвак для аздараўлення супрацоўнікаў і іх дзяцей пры наяўнасці сродкаў ў фондзе вытворчага і сацыяльнага развіцця універсітэта.

**Адказн.** Курава І.А., Кармазін А.П.

7.4. Для супрацоўнікаў праводзіць масавыя спаборніцтвы па праграме спартакіяды "Здароўе", матчавыя сустрэчы з камандамі іншых вну.

**Адказн.** спартклуб.

## 8. ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПРАВАВЫХ ГАРАНТЫЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПРАФКОМА

**8.1. Рэктарат абавязуецца:**

8.1.1. Прадастаўляць камітэту прафсаюза інфармацыю, неабходную для вядзення калектыўных перагавораў і рэалізацыі правоў прафсаюза па абароне працоўных і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў працоўных.

8.1.2. Разглядаць па прадастаўленню прафсаюзнага камітэта абгрунтаваныя крытычныя заўвагі і прапановы, выказаныя членамі прафсаюза ў ходзе прафсаюзных сходаў, канферэнцый, сустрэч у працоўных калектывах, а таксама па выніках праверак, праведзеных прафсаюзнымі органамі. Прымаць ва ўстаноўленным парадку неабходныя меры.

8.1.3. Прафсаюзныя ўзносы ў памеры 1% ад заработнай платы выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта штомесячна адлічваць праз бухгалтэрыю. З іх 10% пералічваць вышэйстаячай прафсаюзнай арганізацыі, 90% — прафсаюзнай арганізацыі універсітэта.

8.1.4. Членам прафкома, не вызваленым ад асноўнай работы, прадастаўляць свабодны ад работы час (3 гадзіны ў тыдзень) для выканання грамадскіх мерапрыемстваў у інтарэсах калектыву.

8.1.5. Пры размеркаванні 10% бюджэтных сродкаў на прэміраванне, прэміраваць старшыню прафкома на ўзроўні прарэктара, а бухгалтара і старшыняў прафсаюзных бюро падраздзяленняў на ўзроўні дэканаў, калі да іх няма заўваг па асноўнай рабоце.

8.1.6. Улік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і размеркаванне жылля праводзіцца рэктаратам з прафсаюзным камітэтам універсітэта.

**8.2. Прафсаюзны камітэт абавязуецца:**

8.2.1. Праводзіць навучанне прафсаюзных кадраў і актыву па пытаннях працоўнага заканадаўства, аховы працы, сацыяльнага страхавання, заработнай платы.

8.2.2. Аказваць матэрыяльную дапамогу членам прафсаюза, якія маюць у гэтым вострую патрэбу, з прафбюджэту ў адпаведнасці з зацверджанымі каштарысамі.

8.2.3. Прэміраваць са сродкаў прафбюджэту работнікаў бухгалтарскіх службаў, якія забяспечваюць збор членскіх прафсаюзных узносаў.

**8.3. Бакі прыйшлі да згоды:**

8.3.1. Ствараць ва ўстанове ўмовы для забеспячэння галоснасці ў дзейнасці прафсаюзнага камітэта і адміністрацыі.

8.3.2. Матэрыяльныя ўмовы для дзейнасці прафсаюзнага камітэта забяспечвае наймальнік (бясплатнае прадастаўленне і ўтрыманне памяшканняў, аргтэхнікі, паперы, сродкаў сувязі, у неабходных выпадках — транспартных сродкаў і інш.).

8.3.3. Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка, а таксама прыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці асоб, выбраных у састаў прафсаюзнага камітэта і не вызваленых ад вытворчай работы, дапускаецца з папярэдняй згоды прафсаюзнага камітэта, а старшыню і бухгалтара прафсаюзнага камітэта, акрамя таго, са згоды прафсаюзнай канферэнцыі калектыву універсітэта.

8.3.4. Скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з прадстаўнікамі прафсаюза, якія ўдзельнічаюць у рабоце камісій па працоўных спрэчках, членамі прафсаюза, упаўнаважанымі весці перагаворы па калектыўных дагаворах, а таксама грамадскімі інспектарамі па ахове працы і кантролю за захаваннем дзеючага заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб працы, а таксама прыцягненне іх да дысцыплінарнай адказнасці дапускаецца са згоды прафсаюзнага камітэта.

## 9. ЗАХАВАННЕ ІНТАРЭСАЎ РАБОТНІКАЎ ПРЫ ПРАВЯДЗЕННІ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

9.1. Пры змяненні форм уласнасці і гаспадарання, стварэнні (заснаванні) малых, сумесных, іншых прадпрыемстваў, фірмаў, кааператываў, дзе задзейнічаны асноўныя фонды і сродкі ўстановы, праводзяцца папярэднія перагаворы з прафсаюзным камітэтам з мэтай дасягнення агульнай згоды ў пытаннях, якія закранаюць сацыяльна-эканамічныя інтарэсы калектыву.

9.2. Перадача, здача ў арэнду маёмасці, якая належыць установе, дапускаецца са згоды прафсаюзнага камітэта.

## 10. АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫКАНАННЯ КАЛЕКТЫЎНАГА ДАГАВОРА, КАНТРОЛЬ, АДКАЗНАСЦЬ БАКОЎ

10.1. Кожны з бакоў, якія падпісалі Калектыўны дагавор, нясе адказнасць за своечасовае і поўнае яго выкананне ў межах сваіх паўнамоцтваў і абавязацельстваў.

10.2. **Бакі прыйшлі да згоды:**

10.2.1. Забяспечваць магчымасць прадстаўні[illegible] другога боку на пасяджэннях сваіх кіруючых органаў пры разглядзе пытанняў, якія складаюць змест Калектыўнага дагавора, а таксама прадастаўляць адзін аднаму неабходныя матэрыялы і дакументы па гэтых пытаннях.

10.2.2. Прымаць меры дысцыплінарнай адказнасці да вінаватых у невыкананні абавязацельстваў Калектыўнага дагавора або тых, хто ўхіляецца ад удзелу ў перагаворах.

10.2.3. Пасадавыя асобы за невыкананне абавязацельстваў Калектыўнага дагавора нясуць адказнасць у выглядзе:

— пазбаўлення надбавак да пасадавых акладаў, прэмій і іншых персанальных выплат;

— прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам аб працы.



Погляд на праблему

# РАДАСЦІ І ЗАСМУЧЭННІ ГАНДБАЛІСТАК

У г.Гродне прайшлі фінальныя гульні Рэспубліканскай студэнцкай спартакіяды па гандболу сярод жаночых каманд.

Нашы дзяўчаты абыгралі каманды БДПА (Мінск) — 40:13, БрДУ (Брэст) — 28:18, ГрДУ (Гродна) — 22:19, "АФВіС" (Мінск) — 25:15, МДУ (Магілёў) — 31:15 і занялі I-е месца. На наступных месцах Гродзенскі і Магілёўскі універсітэты.

Рыхтавалі да спаборніцтваў нашу каманду заслужаны трэнер Беларусі, дацэнт Валерый Крукоўскі і ст.выкладчык Віктар Марчук — абодва з кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры.

Вось што гаворыць аб праблемах гандбола галоўны трэнер універсітэцкай каманды Валерый Крукоўскі:

— Асноўныя нашы праблемы — матэрыяльнага плана. Акрамя гэтага, у нашай вобласці і горадзе амаль не развіваецца жаночы гандбол. Ужо дзесяцігоддзямі ў абласным цэнтры не праводзіцца першынство горада. У г.Гомелі практычна толькі дзве каманды — нашага універсітэта і ДЮСШ-10. А з гарадоў вобласці толькі ў Рагачове старающца развіваць жаночы гандбол. Такім чынам, мы можам разлічваць на папаўненне ў галоўную каманду вобласці "Універсітэт" з двух цэнтраў.

Упраўленне па фізічнай культуры, спорту і турызму Гомельскага аблвыканкома прадастаўляе нам залу для трэніровак у Палацы ігравых відаў спорту, і чатыры гандбалісткі з Рагачова вучацца ў Гомельскім вучылішчы алімпійскага рэзерву.

Аблспорткамітэт выдзяляе грошы толькі на чэмпіянат Беларусі. Больш ніхто нам сродкаў не дае на турніры не толькі ў межах Беларусі, але і бліжняга замежжа.

Мы неаднаразова звярталіся ў гарспорткамітэт аб неабходнасці развіваць гандбол у нашым горадзе. Для гэтага трэба ўключыць у гарадскую спартакіяду школьнікаў і студэнтаў вну жаночы гандбол, але станоўчых рашэнняў няма. А калі гэтага няма, няма і істотнага прагрэсу ў гэтым відзе спорту.

Амаль штогод факультэт фізічнай культуры выпускае спецыялістаў па гандболу, у ДЮСШ вакантных месцаў няма, і яны ідуць працаваць у сярэднія агульнаадукацыйныя школы. Але паколькі ў гарадской спартакіядзе гандбола няма, яны ў школах не культывуюць гэты від спорту.

Вось кола і замыкаецца.

Акрамя гэтага неабходна адкрыць аддзяленне па гандболу ў Гомельскім вучылішчы алімпійскага рэзерву.

Зараз з'явіўся маленькі пробліск: прынята рашэнне пры Гомельскім Палацы ігравых відаў спорту адкрыць аддзяленне жаночага гандбола і запрасіць 2-3-х спецыялістаў. Але гэта, як вы разумееце, не зможа кардынальна вырашыць усе праблемы. Таму ў бліжэйшыя гады чакаць істотнага прагрэсу ад каманды "Універсітэт" — справа бесперспектыўная.

**В.МАРЧАНКА.**

## УДАКЛАДНЕННЕ

Пры падрыхтоўцы да друку спартыўнай інфармацыі "Дзве перамогі нашых студэнтаў", якая была апублікавана ў папярэднім нумары нашай газеты, была дапушчана недакладнасць. У другім абзацы трэба чытаць: "У агульнакамандным заліку на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ўзняліся студэнты нашага універсітэта, якіх трэніруюць Б.Гіль, С.Кузікаў і І.Карніенка".



ЗНАЁМСТВА З ЦУДОЎНЫМ

# ЧАС ПОЎНІ

На рубяжы стагоддзяў узнікае пэўнае светаўспрыманне, сукупнасць адчуванняў і настрояў "канца стагоддзя": тугі, меланхоліі, бясконцай стомленасці, непрыняцця рэчаіснасці. Своеасабліва гэта выражаецца ў творчасці мастака Алега Кахане-віча, які, да таго ж, з'яўляецца работнікам Гомельскага аўтарэмзавода. Наша група наведала выставу яго творчых работ. Экспазіцыя носіць характэрную для ўспрымання свету майстрам назву: "Час поўні".

Уражвае нестандартны падыход творцы да асэнсавання рэчаіснасці. Звычайныя, на першы погляд, тэмы ён вырашае на мяжы фантазіі. Цікавыя ў гэтым плане работы "Время полной луны", "Март", "Голубые озера", "Фантазия в зеленом", "Море и луна" і інш.

Праблема чалавека і яго месца ў свеце, як яе разумее мастак, адлюстравалася ў рабоце "Ускраіна". Маленькая хатка на фоне вялізнага лесу падкрэслівае нязначнасць, мізэрнасць чалавеч[illegible] быцця ў параўнанні з бясконца[illegible]цю сусвету.

Творчую індывідуальнасць Алега Каханевіча мы можам глыбей зразумець, калі паглядзім на "Портрет художника". У ім адлюстравана дваістасць асобы майстра. Ён як бы засланяе твар, каб не бачыць адмоўнага ў свеце. Работа "Все, что в жизни есть у меня" адпавядае характару мастака.

Асаблівую цікавасць уяўляюць работы, у якіх майстра фіксуе свае ўражанні і адчуванні ў колеры. Гэта — "Шелест березовых листьев", "Праздник в городе", "Карагодняя весялосць" і інш.

Можна адзначыць, што галоўнай творчай адметнасцю Алега Каханевіча з'яўляецца філасофскае асэнсаванне стану акаляючай рэчаіснасці, пошук новага спосабу адлюстравання свету.

**Ю.ВЕРХАВЫХ, В.РАЗАНАВА, студэнткі 3-га курса філалагічнага факультэта.**


**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады па кафедры ўсеагульнай гісторыі — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**



Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 270.
Падпісана да друку 16.05.2000 г.